**ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў”**

**Маніторынг: “Асвятленне прэзідэнцкіх выбараў 2010 г. у беларускіх СМІ”**
(11–30 кастрычніка 2010 г.)

**Бюлетэнь №1**
*1 лістапада 2010 г.*
Мінск, Беларусь

## 1. Уводзіны

У справаздачы падсумоўваюцца дадзеныя трохтыднёвага маніторынгу беларускіх электронных і друкаваных СМІ датычна асвятлення прэзідэнцкіх выбараў 2010 г. у Беларусі.

Згодна з графікам Цэнтральнай выбарчай камісіі (ЦВК) Рэспублікі Беларусь, гэты перыяд ахоплівае этап збору подпісаў за патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты.

Зазначым, што маніторынг мае на мэце:

*– ацаніць, наколькі эфектыўна і поўна беларускія медыя здольныя адлюстроўваць разнастайныя палітычныя і грамадскія погляды кандыдатаў у прэзідэнты і іх прыхільнікаў;*

*– прыцягнуць увагу журналісцкай супольнасці краіны да таго, што абавязак медыя – усебакова, поўна і ў адпаведнасці з міжнародна прызнанымі прафесійнымі стандартамі і нормамі інфармаваць выбарцаў пра электаральны працэс, палітычныя платформы і погляды кандыдатаў у прэзідэнты, а таксама ролю іншых удзельнікаў гэтага працэсу;*

*– даць розным удзельнікам электаральнага працэсу дадзеныя, на падставе якіх можна выявіць, наколькі аб’ектыўна і бесстаронна асвятлялася выбарчая кампанія ў дзяржаўных і недзяржаўных медыя;*

*– садзейнічаць фармаванню поўнай карціны прэзідэнцкай кампаніі.*

## 2. Падсумаванне вынікаў

- У дзяржаўных электронных і друкаваных СМІ тэма прэзідэнцкіх выбараў у згаданы перыяд была далёка не прыярытэтнай. Гэткае сцверджанне вынікае, напрыклад, з таго, што тэме выбараў адводзілася часу ў два ці тры разы меней за сюжэты, прысвечаныя надвор’ю.

- Гэтыя ж медыя не падалі аніякіх адмысловых матэрыялаў, прысвечаных збору подпісаў за патэнцыйных кандыдатаў. А калі і паведамлялася пра збор

подпісаў, дык датычна патэнцыйных апанентаў дзеючага прэзідэнта дамінаваў іранічна-прыніжальны тон ды ўжываліся абразлівыя параўнанні.

- У дзяржаўных СМІ дамінаваў станоўчы вобраз толькі аднаго прэтэндэнта ў кандыдаты – дзеючнага кіраўніка дзяржавы. Прозвішчы астатніх прэтэндэнтаў альбо ігнараваліся, альбо толькі ўзгадваліся.

- Акрамя дзеючага прэзідэнта дзяржаўныя СМІ ахвотна асвятлялі дзейнасць ЦВК, тэрытарыяльных камісій і мясцовых уладаў. Палітычныя партыі, што ўдзельнічаюць у выбарах, увагу дзяржаўных медыя не выклікалі. Апазіцыя, калі і ўзгадвалася, дык выключна адмоўна і ў выглядзе дэперсаналізаванага суб'екта.

- Цягам усяго перыяду маніторынгу і асабліва ў яго заключнай частцы названыя вышэй медыя публікавалі матэрыялы, якія ствараюць уражанне перадвызначанасці вынікаў прэзідэнцкіх выбараў.

- У дзяржаўных СМІ зафіксаваны таксама шэраг фактаў асвятлення выбарчага працэсу, не адпаведнага міжнародна прызнаным стандартам і прынцыпам журналісцкай этыкі.

- Недзяржаўная прэса падала больш шырокую карціну выбарчай кампаніі. У той час як дзяржаўныя СМІ фактычна ігнаравалі патэнцыйных кандыдатаў (за выключэннем дзеючага прэзідэнта), недзяржаўныя медыя надалі ім большую ўвагу і ўжо на гэтым этапе выбарчай кампаніі. Некаторыя з іх зрабілі патэнцыйных кандыдатаў галоўнымі дзеючымі асобамі выбарчага працэсу.

- Няма сумневу, што ацэнка суб'ектаў выбарчага працэсу, падаваная недзяржаўнымі СМІ, больш збалансаваная. Тое ж тычыцца і стылістыкі, у якой адсутнічаюць "моцныя", правакацыйныя ці абразлівыя выразы.

Усе гэтыя высновы базуюцца на выніках апрацоўкі дадзеных маніторынгу, што падаюцца ніжэй.

## 3. Асноўныя дадзеныя

### 3.1 Дзяржаўныя медыя

Так, навінная праграма **"Панарама" (**Першы нацыянальны канал Беларускага тэлебачання) адвяла дзеючаму прэзідэнту амаль 75% часу (параўнальна з усімі іншымі суб'ектамі маніторынгу), ЦВК амаль 19%, назіральнікам з краін СНД – 6% і толькі ўзгадала пра патэнцыйных кандыдатаў спп. Някляева і Правалінскага (менш за 0,06%), а таксама Гайдукевіча (0,1%). Прэзідэнта

Лукашэнку і яго дзейнасць праграма ацаніла выключна станоўча, ролю назіральнікаў з краін СНД – нейтральна, а ЦВК – нейтральна і пазітыўна.

Выбарчаму працэсу праграма "Панарама" адвяла 0,86% часу, надвор'ю– 3,45%, спорту 17,4%. Астатні ж час быў прысвечаны іншым тэмам, ад эканомікі і палітыкі да культуры і сацыяльных праблемаў.

Падобная дынаміка назіраецца ў праграме **"Наши новости" АНТ,** у праграме **"Радыёфакт"** Першага нацыянальнага канала дзяржаўнага радыё. У іх параўнальна з астатнімі суб'ектамі маніторынгу сп. Лукашэнка займае адпаведна 69,7% і 79,8% эфірнага часу. Іншыя прэтэндэнты альбо адсутнічаюць, альбо толькі ўзгадваюцца, прычым толькі некаторыя з іх, як, напрыклад, спп. Рыжоў і Раманчук у праграме **"Наши новости".**

Тэме выбараў у названай праграме АНТ было адведзена часу прыкладна ў 2 разы меней за надвор'е, а ў праграме **"Радыёфакт"** – меней у 3 разы.

Праграма **"Навіны Рэгіён"** (Тэлерадыёкампанія "Магілёў") яшчэ менш увагі надала патэнцыйным кандыдатам. Так, прэзідэнт Лукашэнка атрымаў 7% часу, а сп. Гайдукевіч – амаль 0,6%. Іншыя ж прэтэндэнты былі праігнараваныя ўвогуле. Выбарчаму працэсу праграма адвяла 1,6% часу, надвор'ю – 6%, спорту – 4,2%. Адпаведна, астатні час прысвечаны іншым тэмам, не звязаным з выбарамі.

**"СБ"** акрамя дзеючага прэзідэнта (68,3% плошчы параўнальна з іншымі суб'ектамі) не брала пад увагу іншых прэтэндэнтаў. Сярод іншых суб'ектаў, пра якія пісала ў кантэксце выбараў, – апазіцыя (13,6%), ЦВК (11,3%), праўрадавыя арганізацыі (5,1%) і назіральнікі з краін СНД (1,6%). Адзіным суб'ектам, які "СБ" ацэньвала негатыўна, была апазіцыя як неперсаніфікаваны суб'ект, што ў сваю чаргу яшчэ больш адцяняе станоўчую ацэнку прэзідэнта і яго дзейнасці.

Істотных адхіленняў ад вызначаных вышэй тэндэнцый асвятлення выбарчага працэсу не выяўлена і ў астатніх манітараваных дзяржаўных медыя, а менавіта: тэлевізійных праграмах *"В центре внимания" (Першы нацыянальны канал), «Первый городской» (Гомель), "Новости региона" (Магілёў), радыё "Экспрэс 101,3 FM" (Гомель), Абласное радыё (Магілёў),* інтэрнет-рэсурс *www.belta.by*, газеты "*Рэспубліка", "Гомельская праўда" і "Могилёвская правда".*

### 3.2 Недзяржаўныя медыя

**"Комсамольская правда в Беларуси"** за той жа самы перыяд асноўную ўвагу надала прэтэндэнтам на пасаду кандыдатаў у прэзідэнты. Былі згаданыя 11 прозвішчаў такіх асоб. Аднак дзеючаму прэзідэнту (параўнальна з астатнімі) была адведзена большасць газетнай плошчы, амаль 82%. І рэпрэзентаваны ён быў галоўным чынам станоўча. Астатнія 10 прэтэндэнтаў атрымалі на ўсіх разам 18% плошчы і былі рэпрэзентаваныя нейтральна.

Інтэрнет-газета **naviny.by,** у адрозненне ад названых вышэй дзяржаўных медыя і *"Комсомольской правды"*, падала надзвычай шырокую карціну выбарчага працэсу, якая ўлучае 40 суб'ектаў выбарчай кампаніі. Прычым галоўнымі дзеючымі асобамі (актарамі) гэтага перыяду былі якраз патэнцыйныя кандыдаты, ЦВК ды некаторыя палітычныя партыі і рухі. Пры гэтым патэнцыйныя кандыдаты ацэньваліся даволі збалансавана, г. зн. як нейтральна, так і пазітыўна ці адмоўна ў некаторых выпадках.

Газета **"Наша ніва"** таксама падала даволі шырокую карціну выбарчага працэсу ды істотную ўвагу надала патэнцыйным кандыдатам. А відавочным фаварытам, паводле адведзенай газетай плошчы, сярод альтэрнатыўных прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду з'яўляецца сп. Някляеў (29% параўнальна з іншымі суб'ектамі выбарчага працэсу). Прыкладна на 20% меней плошчы было адведзена спп. Раманчуку, Кастусёву, Усу. У пераважна пазітыўным святле ў гэты перыяд газета рэпрэзентуе перадусім Ул. Някляева, Р. Кастусёва і Дз. Уса.

Параўнальна з "Нашай нівай" ці naviny.by газета "**Народная Воля"** рэпрэзентавала менш суб'ектаў выбарчага працэсу. Асноўную ўвагу яна надала ўладзе (да якой паставілася галоўным чынам крытычна), а з усіх патэнцыйных кандыдатаў рэпрэзентавала толькі семярых. Пры гэтым яўную перавагу яна аддала Ул. Някляеву (амаль 14% плошчы параўнальна з усімі астатнімі суб'ектамі, што амаль на 10% болей чым у сп. Саннікава).

На палову менш суб'ектаў за naviny.by рэпрэзентавала газета "**Белорусы и рынок".** Ацэнка патэнцыйных кандыдатаў і іх дзейнасці – выключна нейтральная. А паводле адведзенай кожнаму з іх плошчы ніводны з шасці не меў істотнай перавагі.

## 4. Медыяэфекты

Пад гэтым тэрмінам мы разумеем выпадкі перакручвання, скажэння інфармацыі, няпоўнага, аднабаковага ці тэндэнцыйнага асвятлення фактаў з мэтай паўплываць на меркаваннні чытачоў (выбарцаў).

Першы нацыянальны канал, тыднёвая аналітычная праграма **"В центре внимания"** ад 10 кастрычніка 2010 г. У іранічна-апякунскім тоне датычна палітычных партый вядоўца паведамляе: *"Очень вяло ведут себя политические партии. Наблюдать за работой территориальных комиссий изъявили только 66 человек, из них только 4 от партий. Не исключено, что политический актив просто растерялся в условиях либерального избирательного законодательства и свободной конкуренции идей. Если прежде можно было в любой момент хлопнуть дверью, сославшись на притеснение властей, то теперь даже при всем желании не на что жаловаться. Да и на что жаловаться, если действующий президент лично просит граждан подписываться за выдвижение других кандидатов".*

Першы нацыянальны канал, тыднёвая аналітычная праграма **"В центре внимания"** ад 17 кастрычніка 2010 г. Вядоўца пра апанентаў улады: *"На сбор подписей осталось около двух недель. Времени вполне достаточно для сбора 100 тысяч автографов, если начать работать даже сейчас. Но это в том случае, если политик действительно идет на выборы для победы. Или с шансом на победу. У оппонентов власти все с точностью до наоборот. Они идут на выборы, чтобы проиграть без шансов на победу. Почему я так говорю? Да потому что политик, который идет на выборы побеждать, не будет за два месяца до них звать людей на площадь - протестовать против результатов выборов. Это полный абсурд. Еще никто не знает результатов, а оппозиция уже зовет митинговать. Но этот абсурд имеет только одно объяснение. Оппоненты власти знают, что проиграют, и все что им нужно - устроить парад неудачников для галочки в отчете спонсору. Таким образом, избирательная кампания таких политиков не более чем фарс. Предлагаю простой тест на вшивость. Когда вас попросят поставить подпись, спросите у претендента, пойдет ли он митинговать после выборов. Если "да", то перед вами обыкновенный жулик. Ваша подпись для него ничего не значит, и ваш голос ему безразличен, потому что он не собирается быть президентом и участвует в выборах понарошку".*

**Белта** (http://www.belta.by/ru/all_news/politics/V-Minske-obrazovano-702-uchastka-dlja-golosovanija-po-vyboram-Prezidenta-Belarusi_i_528132.html) ад 18 кастрычніка 2010 г. У матэрыяле "В Минске образовано 702 участка для голосования по выборам Президента Беларуси" ствараецца ўражанне аб нібыта дэмакратычнасці працэсу абрання сяброў тэрытарыяльных камісій. Цытата:

*"Как сообщалось, Минская городская комиссия по выборам Президента Беларуси образована в максимальном составе – в количестве 13 человек (представители 4 политических партий (КПБ, БНФ, БСДП и РПТС) и 9 общественных объединений). В максимальном составе (также по 13 человек) сформированы 9 районных комиссий по выборам Президента с общей численностью 117 человек. 90 человек представляют партии и общественные объединения, 16 человек являются представителями граждан, 11 человек – трудовых коллективов".*

Пры гэтым **Белта** не паведаміла, што: *" оппозиционные политические партии выдвинули в ТИК 92 человека, из них зарегистрированы членами ТИК были только 14. "Это 0,7% общего числа состава комиссий. Более трети кандидатов в члены территориальных избирательных комиссий составили выдвиженцы общественных объединений и профсоюзов. При этом всего пять провластных организаций - ОО "Белая Русь", ОО "Белорусский республиканский союз молодежи", Федерация профсоюзов Беларуси, Белорусский союз женщин и Белорусское общественное объединение ветеранов – выставили 79% от всех кандидатов от общественных объединений и профсоюзов"* (http://news.open.by/politics/37444)

Газета **«Гомельская праўда»,** ад 21 кастрычніка 2010 г., №160-161 (22431-22432), нататка «Офицеры – за позитивный результат». На галоўнай старонцы, у нататцы, якая напісана ў жанры звычайнай навіны, напрыканцы ў двукоссі

прыведзена цытата пра накірунак дзейнасці праўрадавай арганізацыі: *“Члены областной организации Белорусского союза офицеров будут вести разъяснительную работу среди населения “об истинных целях оппозиции и их попытках совместно с внешними силами дестабилизировать общественно-политическую ситуацию в стране”.*

Праграма **“Наши новости”, АНТ,** ад 23 кастрычніка 2010 г. У адным з сюжэтаў журналіст закрануў тэму адмовы былога ўжо патэнцыйнага кандыдата ў прэзідэнты Сяргея Рыжова ад далейшага збору подпісаў. Прычына, якую назваў сп. Рыжоў, – асэнсаваная ім немагчымасць збору неабходнай колькасці подпісаў. Аўтар сюжэту А. Міхальчанка пахваліў сп. Рыжова за шчырасць, але потым скрытыкаваў яго за заяву аб перашкодах з боку ўлады цягам збору подпісаў, назваўшы яе *“враньём”.*

У тым жа сюжэце ён пазнаёміў гледачоў з “праблемай” грамадскага актывіста сп. Міхаіла Башуры: *“Вот и координатор движения “Говори Правду” Михаил Башура попался на подделке справки о доходах. Липовый документ позволил получить льготный кредит*”. Яшчэ цытата: *“Потом Башира примкнул к движению “Говори Правду” и – о чудо! – банальный жулик превратился в политического деятеля”.* І далей: *“Так может и педофила, если он насилует исключительно пионеров и членов БРСМ, считать борцом с режимом?”*

А распачаў А.Міхальчанка наступнымі словамі: *“Рыжый, рыжый, конопатый, снялся с гонки в кандидаты. Вождь предпринимателей тоскует по крыше. А координатор движения “Говори Правду” погорел на обмане”.*

Нарэшце, шэраг пададзеных у дзяржаўных СМІ матэрыялаў, пакідаюць уражанне перадвызначанасці вынікаў выбараў. Прывядзем толькі адну цытату з матэрыяла, апублікаванага **“СБ”** (“Власть делает всё возможное”, ад 30 кастрычніка 2010. http://sb.by/post/107481/). Прэзідэнт *“подчеркнул, что заинтересован в политической конкуренции: «Я народ просил: подпишитесь, поддержите других кандидатов». А сейчас Александр Лукашенко разочарован поведением некоторых потенциальных соперников. Констатировал: «Они сегодня думают о том, как снять свою кандидатуру». И дал свое объяснение поведению оппонентов: «Знают, что у них будет 0,2 процента на выборах. Думают: зачем идти позориться?» При этом Президент подчеркнул, обращаясь к брестчанам: «Я никогда не фальсифицировал выборы! Вы всегда меня избираете огромным количеством голосов».*

Прыведзеныя выказванні мультыплікавалі і іншыя дзяржаўныя медыя.

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## ОНТ/"Наши Новости"
## 11.10.2010 – 30. 10.2010

## Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)







Спорт
13,32%
Выбарчы працэс
3,34%
Надвор'е
4,07%
Іншае
79,26%

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## БТ/"ПАНАРАМА"
## 11.10.2010 – 30. 10.2010

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)







Выбарчы працэс
1,08%
Спорт
17,33%
Надвор'е
3,44%
Іншае
77,38%

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## ТРК “Магілёў”/”Навіны Рэгіён”
## 11.10.2010 – 30. 10.2010

## Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)







Спорт
5,18%
Выбарчы працэс
2,05%
Надвор'е
2,17%
Іншае
90,61%

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## “Советская Белоруссия: Беларусь сегодня”
## 11.10.2010 – 30. 10.2010

## Адзінка вымярэння - см. кв.






# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## “Комсомольская правда”
## 11.10.2010 – 30. 10.2010

## Адзінка вымярэння - см. кв.






# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## NAVINY.BY
## 11.10.2010 – 30. 10.2010

## Адзінка вымярэння - колькасць знакаў






# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## “Наша Ніва”
## 11.10.2010 – 30. 10.2010

## Адзінка вымярэння - см. кв.






# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## “Народная Воля”
## 11.10.2010 – 30. 10.2010

## Адзінка вымярэння - см. кв.






# БЕЛАРУСКІЯ ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2010

## “Белорусы и рынок”
## 11.10.2010 – 30. 10.2010

## Адзінка вымярэння - см. кв.




